14 ТРАЎНЯ 1999г. ПЯТНІЦА

# НАВІНЫ

№55 (586) КОШТ СВАБОДНЫ

стар.7




# ВОЛЕВЫВЯРЖЭННЕ

**Альгерд НЕВЯРОЎСКІ**

**У сераду былі падведзеныя афіцыйныя вынікі кампаніі па выбарах прэзідэнта Беларусі. ЦВК прызнаў несапраўднымі вынікі галасавання па кандыдатах у прэзідэнты — з-за дапушчаных падчас яго парушэнняў, якія паўплывалі на канчатковыя вынікі. Камісія пастанавіла прызначыць паўторныя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на працягу трох месяцаў пасля асноўных выбараў з паўторным вылучэннем кандыдатаў у прэзідэнты.**

Па канчатковых звестках Цэнтрвыбаркама, у галасаванні прыняло ўдзел 4 мільёны 804 чалавека, што складае 53,02 працэнта ад агульнага спіса выбаршчыкаў. Такім чынам, ЦВК прызнала, што выбары ўвогуле адбыліся, але ў частцы падвядзення вынікаў па кандыдатах — не. На думку старшыні ЦВК, гэта здарылася з-за шэрагу прычынаў: перашкоды правядзенню выбараў з боку ўладаў, адсутнасць свабоднага і ўсебаковага абмеркавання праграмаў кандыдатаў і вядзення за іх агітацыі. Па словах Ганчара, Цэнтрвыбаркам адзначыў і грубае парушэнне заканадаўства з боку кандыдата ў прэзідэнты Пазьняка. «Лідэр БНФ распаўсюджваў хлуслівыя звесткі аб сваім суперніку Чыгіры, а таксама заклікаў байкатаваць выбары», — лічыць Ганчар.


Паколькі пераможца выбараў вызначаны не быў, ЦВК прызнала мэтазгодным прызначыць паўторныя выбары. Праўда, гэта зусім не значыць, што гэтыя выбары адбудуцца менавіта праз тры месяцы. На думку Ганчара, галасаванне можна праводзіць толькі ў тым выпадку, калі будуць атрыманыя гарантыі прызнання яго вынікаў з боку АБСЕ і іншых міжнародных арганізацыяў, а таксама арганізаваны сур'ёзны кантроль за правядзеннем выбарчай кампаніі.

Ганчар заклікаў усіх апазіцыянераў аб'яднацца і разам дамагацца вызвалення экс-прэм'ера. Прынамсі, Ганчар лічыць гэта сваім маральным абавязкам. Моцна нашкодзіў выбарчай кампаніі і Зянон Пазьняк, які, на думку Ганчара, проста «падставіў» шараговых сумленных сяброў БНФ, якія аддана працавалі на выбарчую акцыю. «Дзеянням усіх тых, хто перашкаджаў правядзенню выбараў, у будучыні павінна быць дадзеная адпаведная юрыдычная ацэнка», — лічыць Віктар Ганчар. Прайшоўся старшыня ЦВК і па журналістах, якія крытыкавалі яго ную дзейнасць. На думку Віктара Іосіфавіча, гэтым спадарам трэба было не лямантаваць, а браць у рукі скрыні для галасавання і ісці па кватэрах. А, маўляў, маралізаваць калі гэта не патрэбна можа кожны і яшчэ атрымліваць грошы на барацьбу з амаральным рэжымам.

Распавёў старшыня ЦВК і некаторыя падрабязнасці аб закрытым мемарандуме, які Ганчар і Чыгір прапаноўвалі падпісаць Пазьняку. Кандыдаты ў прэзідэнты павінны былі, у выпадку перамогі, выканаць шэраг абавязацельстваў. Напрыклад, дабраахвотна абмежаваць прэзідэнцкія паўнамоцтвы, правесці дэмакратычныя выбары ў парламент і захоўваць дзяржаўны суверэнітэт. Пазьняк, аднак, спачатку запатрабаваў унесці ў мемарандум пункт аб спыненні любых адносінаў з імперскай Расіяй, а пазней наогул адмовіўся падпісваць дакумент.


Ганчар лічыць, што сваім удзелам у акцыі людзі прадэманстравалі недавер да асобы Аляксандра Лукашэнкі. І гэты вынік выбарчай кампаніі Ганчар лічыць асноўным. ■

## Як ацэньваюць вынікі праведзеных апазіцыяй прэзідэнцкіх выбараў вядомыя ў краіне палітыкі? Перамога гэта ці параза?



**Сягрей КАЛЯКІН (першы сакратар ЦК ПКБ):**

— В этой избирательной акции в первую очередь победил белорусский народ. Выборы позволили напомнить Лукашенко: срок его президентских полномочий истекает. Люди в своем большинстве желают новых выборов главы государства. Что касается политиков, участвовавших в этой кампании и не достигших своих личных целей, то это их проблема. Те дивиденды значительно превосходят амбиции отдельных политиков.



**Андрэй САННІКАЎ (каардынатар Хартыі-97 па міжнародных сувязях):**

— Калі гаварыць пра сам працэс выбараў, то нельга сказаць адназначна — перамога гэта ці параза, але ўнутры самога працэсу ёсць і пераможцы, і пераможаныя. Гэта параза для пэўных палітыкаў, якія не здолелі задаволіць патрабаванняў людзей. У гэтых выбарах магло б і жадала ўдзельнічаць значна больш людзей. І перамаглі ў акцыі беларускія грамадзяне, якія не пабаяліся сказаць сваё «не» цяперашняй уладзе.



**Уладзімір БАРАДАЧ (каардынатар выбарчага штаба Міхаіла Чыгіра):**

— Результат выборов для нашей команды был довольно неожиданным. По нашим сведениям, Чигирь выиграл у Пазьняка по всем параметрам. А если говорить вообще, то в результате выборов проиграл один человек —Лукашенко. Может быть, еще и Зенон Пазьняк. Общество проголосовало за новую Беларусь — поэтому выиграло общество.



**Мечыслаў ГРЫБ (в.а.старшыні Нацыянальнага выканаўчага камітэта):**

— Гэта самая вялікая палітычная акцыя апазіцыі пасля 1996 г., і я яе разглядаю менавіта як акцыю. Яна паказала, што людзі хочуць выбараў і спадзяюцца на выбары. Гэтая кампанія нагадала прэзідэнту аб заканчэнні ягоных паўнамоцтваў, а беларускаму народу і міжнароднай грамадскасці — аб неабходнасці правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы. Вярхоўны Савет выканаў свае абавязкі, а тое, што не адбылося так як хацелася, што ўлады не далі працаваць ЦВК — гэта іншая справа. Вінаваціць у гэтым апазіцыю не варта. Нельга таксама і вызначыць канкрэтнага пераможцу ў выбарах.



**Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ (нам.старшыні АГП):**

— Назваць выбары паразай немагчыма, бо шмат зроблена для таго, каб людзі зразумелі, што час выбараў надышоў. Але і перамогай назваць гэтую акцыю я не магу. Перамога будзе тады, калі людзі дэмакратычна абяруць новага прэзідэнта краіны. Гэтая выбарчая акцыя толькі крок наперад да дэмакратыі, які мы павінны былі зрабіць.



**Станіслаў ШУШКЕВІЧ (экс-спікер ВС 12-га склікання, лідэр БСДГ):**

— Афіцыйна па выніках выбараў нельга было вызначыць пераможцу. Перашкаджалі кампаніі і такія дзеячы, як там у вас друкуюцца, а таксама асобы, якія зразумелі, што яны не змогуць зацвердзіцца. Я ўжо не кажу аб супрацьдзеянні з боку ўладаў. Тое, што ў выбарах прыняло ўдзел больш за палову маючых права голасу, у мяне няма сумневу. Народ спрабавалі ў чарговы раз пазбавіць права выбару, але ён сваю думку выказаў. Таму трэба дзейнічаць у адпаведнасці з Канстытуцыяй, і калі пераможца не вызначаны, то ёсць асоба, якая павінна выконваць абавязкі прэзідэнта пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Лукашэнкі.

# Конец света отложили до 17.00

## Этот выпуск газеты НАВІНЫ был под угрозой срыва и мог не выйти в свет

Белорусские власти перешли к новым методам борьбы с независимой прессой. Теперь нам отключают свет.

Начальник ЖЭС-12 Зубов Ростислав Викторович отдал распоряжение отключить электроэнергию в помещении, которое занимает редакция. Когда товарищ Зубов оглашал по телефону свое решение, трубка нашего аппарата покраснела. Печально, что власти пытаются превратить в душителей свободной прессы даже работников жилищно-коммунальных служб. Путем различных ухищрений мы смогли оттянуть «конец света» до 17.00, чтобы успеть сверстать газету.

Несмотря ни на что, дорогие читатели, мы и дальше будем своевременно, полно и честно информировать вас о происходящих в стране событиях.

***Ваши НАВІНЫ***

**ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ**

## Разобрались с Климовым, теперь с его банком

Национальный банк Беларуси объявил о принудительной ликвидации АКБ «Корпобанк» и Частного строительного банка А.Климова. Такое решение Нацбанк принял из-за нарушения этими финансовыми учреждениями законодательства, регулирующего банковскую деятельность.

***Отдел информации***

## Да канца лета без гарачай вады

Да 25 жніўня ў Мазыры адключана падача гарачай вады ў жылыя дамы, арганізацыі і на прадпрыемствы, за выключэннем медустановаў, піваварнага і малочнага заводаў. Гэтае рашэнне прыняў гарвыканкам у сувязі з дэфіцытам бюджэтных сродкаў.


***Аддзел інфармацыі***

## Два гады турмы за лухту ў справаздачы

А.Лукашэнка падпісаў дэкрэт, якім узмацняецца адказнасць чыноўнікаў за дакладнасць статыстычных дадзеных. Калі чыноўнік наўмысна сказіў справаздачу ці хаця б спазніўся з перадачай лічбаў у статыстычныя органы, яго пакараюць штрафам да 100 мінімальных заробкаў. Тыя ж дзеянні, зробленыя паўторна, цягнуць ужо на 300 мінімалак. Калі скажэннем інфармацыі нанесеная шкода дзяржаве, падманшчыка чакае пакаранне па 171-ым артыкуле Крымінальнага кодэкса — за службовы падман. А гэта 2 гады турмы альбо выпраўленчай працы. Накладваць штрафы на чыноўнікаў за падман будуць кантралёры Камітэта дзяржкантролю, а разглядаць крымінальныя справы —суды.

***Алесь ПАЎЛОВІЧ***

**НАДВОР'Е**




**22 траўня** па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў, вецер паўднёва-усходні, 6—11 м/сек. Тэмпература паветра ноччу 4—9 градусаў цяпла. **23 траўня** месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер паўднёва-заходні, 6—11 м/сек, пры навальніцах парывы да 14 м/сек. Тэмпература паветра ноччу 7—12 градусаў цяпла, днём па **Гродзенскай** і **Брэсцкай** абласцях 16—21 градусаў цяпла, месцамі да 25. На астатняй тэрыторыі 21—26 градусаў.

**Курс наяўнага долара на «чорным рынку»**

**430 000**

ПЯТНІЦА З МІКАЛАЕМ ХАЛЕЗІНЫМ

## Атомный дырокол «Ленин»

*Нас часто спрашивают, почему мы так часто меняем правительство. Лучше часто, чем раз в 30 лет.*

***Владимир Жириновский***

Не могу не согласиться с уважаемым Владимиром Вольфовичем - лучше чаще. Но в России. Там что ни премьер, то прикол. Сначала Черномор был с очень смешными выступлениями. Бывало, как начнет фразу, так через десять минут не знает как закончить. Так и ушел на полуслове. Потом пришел Киндер-сюрприз. Парень умный и от этого страдающий. Бойко на вопросы отвечал, но карьеру ему это не спасло. Не в лучшее время пришел - как раз когда в стране последние деньги разворовали. Пришлось им тогда старый Примус раскочегаривать. Тот был дедушка видный - с разведывательным прошлым, пенсионным будущим и брежневской внешностью. Он уже почти застарелый радикулит залечил, пользуясь служебным положением, но тут ему другой дедушка намекнул, что тот «неправильно сел». Теперь пришел разведчик со своим анекдотом. А анекдот такой: «Кто проголосовал за Степашина, тот может опустить руки и отойти от стены».

Каждый шутник, который у них приходил на пост премьера, разворачивал корабль в обратную сторону. Может, они так правильный курс ищут... Трудно сказать. Но нашу баржу от их разворотов кувыркает по всей акватории. Когда Киндер-сюрприз руководил, еще нормально было. Он счета за газ, нефть и электричество выставил, а мы их не оплатили. Обычная история. А Черномор с Примусом все мечтали из нашей самоходной баржи сделать спасательную шлюпку, погрузив себе на борт. Хорошо, что не получилось. А то носило бы нас по морю тудасюда с непредсказуемым капитаном.

А сейчас все вроде нормально - гребем против течения. Капитан у нас толковый - из боцманов. Боцман - бывший кок. Кок раньше был штурманом. А штурмана нет - его капитан в трюм посадил. Плыть бы нам и плыть, борясь со стихией. Но есть одна проблема - команда ропщет. А примета это плохая: пару месяцев поропщет, а потом «черную метку» капитану пришлет.

СКАНДАЛ

# Рускія нацысты атрымалі карт-бланш

**Алякей ШЫДЛОЎСКІ**

**Пасля трох месяцаў папярэдняга расследавання следчы Партызанскага РАУС горада Мінска В.Насановіч прыпыніў вытворчасць па крымінальнай справе, узбуджанай па факце збіцця ў лютым гэтага года каардынатара Хартыі'97 па міжнародных пытаннях Андрэя Саннікава і двух актывістаў гэтай арганізацыі Алега Бябеніна і Зміцера Бандарэнкі. Нагадаем, што збіццё адбылося ў самым цэнтры Мінска, каля плошчы Перамогі, а напад учынілі прадстаўнікі Рускага Нацыянальнага Адзінства.**

За час следства было праведзена некалькі дзесяткаў допытаў і некалькі вочных ставак. Высветлілася, што дваццацціцю малойчыкамі, якія здзейснілі напад, кіравалі лідэры РНЕ на Беларусі Самойлаў і Пятроў, а той афіцэр у ваеннай форме, які, здавалася, прыйшоў на дапамогу хартыстам, хутчэй за ўсё, каардынаваў дзеянні нацыстаў. Таксама давялося даведацца, што прыхільнікі Баркашова афіцыйна зарэгістраваныя ў мінюсце як клуб «Коловрат», і больш таго, зарэгістраванай нават стылізаваная свастыка — яго эмблема.

Падчас следства пацярпелы Зміцер Бандарэнка не раз атрымоўваў пагрозы расправіцца з ім і з ягонымі блізкімі.

Згодна атрыманай з РАУСа паперы, следства прыпыненае на падставе... арт. 5 п.2 крымінальна-працэсуальнага кодексу Рэспублікі Беларусь «за адсутнасцю складу злачынства»! Следчыя прапанаўваюць пацярпелым напісаць заяву на ўзбуджэнне крымінальнай справы па артыкуле 110 КК РБ у прыватным парадку. Згодна гэтаму артыкулу пацярпелым былі нанесеныя толькі лёгкія пабоі. Між тым у Андрэя Саннікава былі зламаныя нос і рэбры.

Актывісты Хартыі'97 адмовіліся ад напісання ўсяляюх заяваў, бо лічаць, што пры гэтай уладзе дабіцца праўды ў судзе будзе немагчыма.

«Калі ўжо тут спынілі крымінальную справу супраць нацыстаў, то можна з упэўненасцю сказаць, што цяперашняя ўлада выдае нацыстам картбланш», — кажа Алег Бебенін. І ён мае рацыю. Серабранка, Малінаўка, Чыжоўка заклееныя ўлёткамі з прапагандаю фашызму, на вуліцах зноў з'яўляюцца малойчыкі ў камуфляжы са свастыкай на рукаве.

На Беларусі зараз РНЕ прысутнічае ў 20 гарадах. У Мінску некалькі дзесяткаў пастаянных членаў гэтай нацысцкай арганізацыі, якая ставіць сваёй мэтай «прыход рускага парадку».

На думку Андрэя Саннікава, Аляксандр Лукашэнка ўзяў цяпер РНЕ пад крыло, а разам з гэтым і нясе адказнасць за усе дзеянні, якія будуць праводзіцца баркашоўцамі. ■

# «Рыжего — фас!»

**Отдел информации, Калинковичское представительство БХК**

Такую команду и звуки выстрелов услышали в среду десятки людей, оказавшиеся среди бела дня возле самого оживленного места в Калинковичах — платной стоянки автомобилей у гастронома «Юбилейный». Команду отдавали люди в камуфляже, в масках. Команда была адресной — догнать убегающего светловолосого парня. В Калинковичское представительство БХК обратились очевидцы случившегося и несколько пострадавших от очередного произвола силовых структур.

Похоже, что внезапные тренировочные налеты вооруженных силовиков в камуфляже на мирных людей стали обыденной реальностью в Беларуси. Положили на асфальт всех, кто в момент нападения находился на площадке. Кому-то дали по ребрам, по голове, кого-то прицепили наручниками к поручням ограждения, стреляли в воздух, догоняли, сбивали с ног. Вся эта показная демонстрация силы и беспредела на глазах у десятков обезумевших от увиденного прохожих лишний раз подтверждает, что Беларусь все дальше и дальше уводят от цивилизованного мира туда, где диктатура и террор, как гильотина, становятся лучшим лекарством от любых болезней. ■

# Яшчэ 90 дзён

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

Учэрвені ў Боне адбудзецца чарговая міжнародная канферэнцыя па праблеме выплаты кампенсацыяў ахвярам падняволвальнай працы часоў Другой сусветнай вайны. На нядаўняй падобнай нарадзе ў Вашынгтоне дэлегацыі зацікаўленых краінаў вырашылі на працягу бліжэйшых дзевяноста дзён разабрацца з арганізацыйнымі пытаннямі. Па словах старшыні беларускага фонда «Узаемаразуменне і прымірэнне» Валянціна Герасімава, удзельнікі вашынгтонскай сустрэчы абавязаліся не даваць ніякай інфармацыі для прэсы і нават падпісалі адпаведную паперу.

На канферэнцыі ў Вашынгтоне некаторыя краіны выказалі незадавальненне памерам кампесацыяў ахвярам нацызму, выдзеленых нямецкім бокам раней. Спрэчным было пытанне наконт таго, хто павінен выплачваць грошы - нямецкі ўрад альбо напрамую самі прадпрыемствы. Беларуская дэлегацыя выступіла з прапановай пашырыць катэгорыю грамадзянаў, якія змогуць атрымаць новыя кампенсацыі. Да іх прапануецца далучыць нават былых ваеннапалонных. Па словах кіраўніка дэлегацыі, намесніка міністра замежных справаў Уладзіміра Герасімовіча, невядома, як быць з тымі грамадзянамі, якія працавалі, напрыклад, у Аўстрыі або ў лагерах прыфрантавой зоны. Усе гэтыя пытанні будуць вырашаныя яшчэ на дзвюх нарадах, якія адбудуцца да верасня гэтага года. В.Герасімовіч не выключае магчымасці падачы іскаў з беларускага боку да нямецкіх прамысловых прадпрыемстваў. ■

АНОНС

## Адбудзецца памінальны малебен

25 мая 1917 года сярод раскашуючай крымскай вясны ў Ялце самотна памёр вялікі беларускі паэт Максім Багдановіч. Гэты трагічны дзень стаў днём нашага агульнага смутку. У 12 гадзінаў запрашаем усклацці кветкі да помніка М.Багдановічу ўсіх, каму дарагі Максімаў вобраз і яго неўміручая паэзія. Словы любові і пашаны скажуць вядомыя паэты, прагучаць бардаўскія песні. У 13 гадзінаў у Свята-Петрапаўлаўскім саборы адбудзецца памінальны малебен па М.Багдановічу.

**Літаратурны музей М.Багдановіча**

**Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны**





ЦЫТАТА НУМАРА

**Власть должна быть моральной, а политические приемы для ее достижения должны быть в соответствии с принципами, желательно моральными, поскольку мы имеем дело с совершенно аморальными циничными субъектами.**

***Виктор ГОНЧАР***

*Пресс-конференция по итогам проведения президентских выборов, 19 мая 1999 г.*

## Страляніна на Нямізе

**Алесь ПАЎЛОВІЧ**

Міліцыянер Аляксандр Жыдзік, бацька чатырох дзяцей, загінуў у перастрэлцы з бандытамі, якія забраліся ў адну з кватэраў прэстыжнага дома на вуліцы Нямізе ў Мінску.

Нарад міліцыі прыехаў праз тры хвіліны пасля таго, як на пульт аховы прыйшоў сігнал «трывога». Аднак злодзеі не сталі здавацца, а адкрылі пальбу. Прапаршчык Жыдзік быў забіты на месцы, другі міліцыянт — сяржант Андрэй Мароз — цудам застаўся жывы. Бандыты захапілі зброю забітага і збеглі. Іх дагэтуль шукаюць. Міліцыя звяртаецца з просьбай да грамадзянаў паведамляць па тэлефоне 02 любую інфармацыю, якая можа быць карыснай для росшуку небяспечных злачынцаў. Дарэчы, у бягучым годзе гэта ўжо другая смерць міліцыянера пры выкананні службовых абавязкаў. У 1998 годзе ад рук злачынцаў загінулі 4 супрацоўнікі беларускай міліцыі. ■

## Митинг в поддержку Чигиря

**Отдел информации**

Минский горисполком дал разрешение на проведение шествия и митинга в защиту прав человека. Главные требования митинга, который состоится 24 мая, — освободить Михаила Чигиря, Андрея Климова, Владимира Кудинова и других политзаключенных. Сбор участников манифестации состоится на площади Я.Коласа в 16:30, с 17:00 до 18:00 разрешено шествие до сквера, носящего имя другого белорусского классика — Янки Купалы. Возле памятника поэту намечено провести часовой митинг. Свое участие в мероприятиях протеста подтвердили ведущие политические партии и правозащитные организации Беларуси. Организаторы обратились также с предложением поддержать акцию и к руководству БНФ.

Предполагается, что в митинге примет участие несколько тысяч человек. Примечательно, что акция протеста пройдет именно 24 мая, в день рождения М.Чигиря, признанного многими правозащитными организациями мира узником совести. ■

## «Зноў сустрэне Сувораў Касцюшку»

**Надзея СВЯТЛІЧНАЯ**

Маскоўскі вайсковы генералітэт рыхтуецца патрывожыць усю натаўскую Еўропу грандыёзным 200-годовым юбілеем швейцарскага паходу фельдмаршала Суворава-Рымніцкага.

Зусім верагодна, што і беларускія «інтэгрэсты» ў пагонах не абмінуць магчымасць паўдзельнічаць ва ўхваленні сілы расійскага штыка, паколькі ўлада ўсё яшчэ шануе імя Суворава ў назве вуліц, мемарыяльнага музея і больш як у пяцідзесяці тапанімічных найменнях.

Між тым, маральнае аблічча камандзіра кацярынінскіх грэнадзёраў ніяк не стасуецца са шчырымі прывязкамі двух народаў. Гэты кат задушыў паўстанне Емяльяна Пугачова і ўтапіў у крыві беларуска-польскае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. За ўбіенных мужыкоў Беларусі імператрыца надзяліла Суворава былым каралеўскім маёнткам з 6.929 прадстаўленымі па ведамасці душамі мужчынскага полу. У фальварку ў Кобрыне пасля вяртання з Альпаў, на пачатку 1800 года, слабы на здароўе 70-гадовы генералісімус спазнаў царскую няміласць ад Паўла І, які забараніў яму з'яўляцца ў Пецярбурскім палацы.

Вядома, гісторыя наблізае час справядлівых рахункаў. І ўсё менш шанцаў на жывучасць расійскіх традыцыяў сярод беларусаў. Вось і зараз экскурсаводы ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі затрымліваюць увагу наведвальнікаў на вызваленым месцы для бюста Суворава. Тут неўзабаве будзе размешчаны бюст Тадэвуша Касцюшкі, створаны брэсцкім скульптарам А.Паўлючыкам. Адначасова побач, на новым стэндзе, паявілася колькасць праўдзівай інфармацыі пра геройчную мужнасць паўстанцаў 1794 года. ■

## Пачаўся суд над Скочкам

**Аляксей ШЫДЛОЎСКІ**

Пачаўся судовы працэс над Югенам Скочкам, намеснікам старшыні «Маладога Фронту». Падсудны адмовіўся размаўляць на рускай мове, матывуючы гэта тым, што не вывучаў гэтай мовы ў школе.

Даволі нестандартна павёў сябе суддзя Мінскага гарадскога суда Валерый Камісараў. Спачатку ён пачаў допыт падсуднага, але пасля таго, як Скочка паведаміў яму, што абвінавачае заключэнне атрымаў толькі 17 траўня, адклаў судовае пасяджанне на 24-е, панядзелак, з мэтай даць падсуднаму і ягонаму абаронцу Сяргею Лепешу дадатковы час на азнаямленне з абвінавачаннем.

Нагадаем, маладафронтавец абвінавачваецца згодна артыкулу 186/3 у арганізацыі дзеяннаў, парушаючых грамадскі парадак, і пагражае яму да трох гадоў турмы. ■

# «У нас і без вас праблемаў хапае»

**Кастусь ТАРАСАЎ**

**Расійская «Общая газета» на гэтым тыдні апублікавала інтэрв'ю, якое даў галоўнаму рэдактару Я. Якаўлеву лідэр руху «Яблоко» Грыгорый ЯЎЛІНСКІ. Інтэрв'ю прысвечанае ацэнкам саюза Беларусь — Расія і пазіцыям прэзідэнтаў Б.ЕЛЬЦЫНА і А.ЛУКАШЭНКІ.**

Яўлінскі выказаўся адносна саюза наступнай формулай: «Эканамічны саюз — так. Аб'яднанне дзвюх дзяржаваў — не». Лідэр «Яблока» лічыць, што Беларусі і Расіі трэба пачынаць з руху да такой эканамічнай інтэграцыі, якая ёсць у Еўропе. «Пры гэтым неабходна ўлічыць розніцу ў патэнцыяле нашых краінаў, у колькасці насельніцтва, у эканамічных рэсурсах». На думку Яўлінскага, ёсць шмат няпростых праблемаў: розны стан эканомікі, яе механізмаў, розны ўзровень жыцця. Таму «бяздумнае аб'яднанне... прывядзе да вялікіх ускладненняў».

Рухавіком інтэграцыі Яўлінскі лічыць суб'ектыўныя разлікі расійскага і беларускага прэзідэнтаў. На ягоную думку, «цалкам магчыма, што Ельцыну гэта неабходна дзеля таго, каб захаваць сваю прэзідэнцкую пасаду і пасля 2000 года. Калі такі саюз будзе ўсталяваны, дык у ім магчыма і не выбірацца: прызначаецца прэзідэнт саюзнай дзяржавы. Такі сюжэт падыходзіць і Лукашэнку. Ён мяркуе, што здолее Ельцына перайграць і выйсці на расійскую палітычную арэну, няважна, у рэшце рэшт, у якой якасці — аб'яднаным, раз'яднаным — і ўвайсці ў нашае палітычнае жыццё».

На пытанне пра далейшую чыннасць абодвух прэзідэнтаў Яўлінскі адказаў, што не бачыць магчымасці для прагнозаў, бо «мы маем справу з двума людзьмі, якія не лічацца ні з чым, могуць прымаць любыя рашэнні. Яны будуць рухацца ў ранейшым напрамку, цынічна скарыстоўваючы пачуцці людзей, дружбу, братэрства, боль за развалленую краіну».

Па словах Яўлінскага, рух «Яблоко» распрацаваў свой тэкст дамовы для стварэння эканамічнага саюза, і накіраваў яго Ельцыну і Лукашэнку. Змест адказу адміністрацыі беларускага прэзідэнта падкрэсліваў, што «Беларусь — суверэнная дзяржава і не будзе цярпець ніякіх дзеянняў, што ўшчамляюць яе суверэнітэт». Яўлінскі называе адказ правільным, але не разумее, нашто ў такім выпадку гаварыць пра саюз увогуле. Калі краіны, тлумачыць Яўлінскі, «з парога ўсё адмятаюць, застаецца пацінуць плячыма: мы да вас не прыстаём, вы ж увесь час сюды ездзіце, чагосьці дабіваецеся. Калі вас не цікавіць эканоміка, значыць, вас не цікавяць людзі, іх беды, узровень жыцця, іх дабрабыт. Вас цікавіць, як бы атрымаць пляцоўку для далейшага павелічэння свайго палітычнага ўплыву на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. А мы не жадаем, каб ваш уплыў у нас павялічваўся. Тое, што вы робіце ў Беларусі, нам не зусім падыходзіць. Хочацца займацца інтэграцыяй — займайцеся канкрэтнымі эканамічнымі справамі. Усё астатняе мы разглядаем як замах на ўладу ў Расіі. А ў нас і без вас праблемаў хапае».

Палітычны саюз Беларусі і Расіі, на думку Яўлінскага, не адпавядае расійскім законам. Яўлінскі лічыць, што стварэнне саюза адгукнецца «з'яўленнем «гарачых кропак» у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай абласцях, дзе актыўна дзейнічае БНФ». Узмоцніцца таксама нестабільнасць у Расіі, злучаная з рэакцыяй нацыянальных рэспублікаў, што зараз уваходзяць у склад Федэрацыі. Сярод аддаленых благіх наступстваў саюза Яўлінскі адзначае магчымасць аспрэчання заходніх межаў Беларусі, як толькі яна ўвойдзе ў склад Расіі. Бо Пакт Молатава — Рыбентропа юрыдычна нікчэмны. Польскі ўрад ці пэўныя палітычныя сілы Польшчы могуць акцэнтаваць увагу на несапраўднасці сваіх існуючых усходніх межаў.

Усё разам прымушае паставіцца да стварaемага саюза з большай адказнасцю, не маніпуляваць дзяржаўным суверэнітэтам Беларусі, хоць гэта і падабаецца расійскай палітычнай эліце. ■

## КАМЕНТАР НАВІНАЎ

Выказаная лідэрам «Яблока» засцярога пра межы ўздымае вельмі важную праблему еўрапейскага значэння. Для Беларусі гэта і балючая тэма гістарычнай няспраўядлівасці. Пакт Молатава — Рыбентропа, які ўхваляў падзел даваеннай Польшчы паміж СССР і Германіяй, і з якога пачалася Другая сусветная вайна, з пункту гледжання Беларусі, паслужыў уз'яднанню ўсходніх і заходніх беларускіх земляў і вярнуў цэласнасць народа, разбітую Рыжскай мірнай дамовай 1921 года, дзе прадстаўнікоў Беларусі не было. Тады Польшча і Савецкая Расія абрабавалі Беларусь, пакінуўшы ад яе 6 раёнаў Мінскай вобласці. Тое, што адбылося ўвосень 1939 года, адпавядала такому ж неабходнаму аб'яднанню дзвюх частак Беларусі, якім у наш час было аб'яднанне Усходняй і заходняй Германіі. Іншай трактоўкі адраджэння Беларусі ў этнічных межах не можа існаваць. Тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Беларусі азначалі б беспадстаўную агрэсію. Беларусь не выступае з прапановамі перагляду межаў, хоць мае гістарычную аснову зрабіць гэта ў дачыненні да некаторых сваіх суседзяў. Польскія межы былі прасунутыя на ўсход у XVI стагоддзі з прымяненнем узброенай сілы, і агляд гістарычных падзеяў, якія датычаць перасоўвання межавых знакаў, будзе не на карысць любой краіны, якая будзе адшукваць свае правы на беларускія землі ў паперах, што падпісваліся за Беларусь прадстаўнікамі акупацыйных рэжымаў. Іншая справа, што для Польшчы 1939 год азначаў вайну на два фронты, Катынь для вайскоўцаў, сібірскія лагеры для «сацыяльна-небяспечных элементаў» (памешчыкаў, кулакоў, прадпрымальнікаў і г. д.). Большасць іх былі паланізаванымі беларусамі, аднак усе яны былі на той час грамадзянамі Польшчы. Таму патрабуе асэнсавання маральны бок той трагедыі, якая мае глыбокія карані і не можа быць вырашана простымі юрыдычнымі спасылкамі. ■

УЛАДА

# Смертники! Кто на новенького?

## Опять решается судьба правительства и лично Сергея Линга

**Вика ТУРОВА**

**Отставка правительства — дело заразное. Не успел Степашин занять кресло Примакова в Москве, как в Минске заговорили о кадровых переменах в белорусском правительстве. В день сдачи номера все заместители премьер-министра держали отчет перед Лукашенко.**

Снимать Линга с насиженного места журналисты просто устали. Информация об отставке убеленного сединами государственного мужа появлялась с навязчивой периодичностью раз в квартал в течение трех лет. Так же упрямо Сергей Степанович подавал и собственные заявления «по собственному желанию». И наверное, ни один человек в стране не ждет с такой надеждой наступления пенсионного возраста, чтобы вздохнуть спокойно.

По оценкам экспертов «Интерфакса», в этом году Лукашенко был очень близок к принятию решения об отставке нынешнего кабинета министров 27 апреля. Во всяком случае, именно в этот день он признал работу правительства неудовлетворительной. Невыполнение кабинетом Линга прогнозных, а значит, заведомо нереальных экономических показателей развития страны — вот причина негативного отношения А.Лукашенко к деятельности Совмина. Но чуда не свершилось. Чиновники ударили челом и клятвенно пообещали исправиться. Президент пригрозил, что сделает соответствующие оргвыводы в случае, если правительство вновь не выполнит своих обещаний. Вряд ли он поверил, конечно, потому что понимает нереальность своих требований. Но снимать правительство накануне саммита в Москве...

На этой неделе отставку правительства в Минске ждали во вторник, когда Александр Лукашенко проводил совещание по вопросам ценообразования. Сверкая очами, президент предупредил, что тем, кто обещаний своих не выполнил, лучше уйти самим и по-хорошему. Однако то ли смельчаков на выход не нашлось, то ли желающих занять места «смертников» не так уж много, но до настоящего времени свои посты сохранили все.

А с ценообразованием действительно беда. Если уж президент прямо в телевизор говорит, что в стране гиперинфляция, значит все — тушите свет. Ведь еще на днях данные статистики везде и всех уверяли, что ВВП и реальные доходы, вопреки всем законам физики и экономики, растут. А тут раз — и 60-процентное увеличение индекса потребительских цен за полгода или 5-процентов за первую неделю мая, как кому больше нравится. «Народ не понимает, что творится в ценообразовании», — уверяет президент. Да и где ж ему, бедному, разобраться, если свежо еще в памяти заявление всем любимого о том, что ценообразованием он будет заниматься лично.

Лукашенко поручил правительству до 1 июня текущего года устранить все выявленные в ходе данного совещания недостатки в ценовой политике. За две недели, то есть. Реально ли это? ■

# Открытое письмо

## Председателю Высшего хозяйственного суда Республики Беларусь Бойко В.В.

Уважаемый г-н Председатель!

13 мая 1999 года судебная коллегия ВХС под Вашим председательством рассмотрела наши иски к Государственному комитету Республики Беларусь по печати о признании недействительными предупреждений, вынесенных в адрес наших газет. Вопреки ходатайствам о переносе слушания дела на более позднее время, Вы решили провести судебный процесс без присутствия наших законных представителей и нас самих, в одночасье определив судьбу ведущих независимых газет. Накануне своим определением Вы обозначили эти дела как представляющие «определенную сложность», «социально-политическую значимость», и отметили, что они вызвали «повышенный интерес ряда международных организаций».

Вынесенное решение перевернуло все с ног на голову: истцы по сути были превращены в ответчиков, а ответчик оказался в «белых одеждах».

Госкомпечати в своих предупреждениях огульно обвинил нас в «захвате власти» и «призывах к захвату власти», то есть в совершенных особо опасных преступлениях.

В решении БХС от 13.05.99 г. Вы избежали подобных формулировок. И на том спасибо! Иначе Вам пришлось бы направлять наши иски и породившие их предупреждения в органы прокуратуры или КГБ для решения вопроса о возбуждении против нас уголовных дел.

И тем не менее Вы не смогли уйти от политических оценок этого дела, определив фактически средства массовой информации, коими и являются наши газеты, как «пособников» оппозиционных сил страны, как исповедующих и защищающих единственную идеологию.

Со всей ответственностью заявляем Вам и всем тем, кто стоит за кулисами этого процесса:

— мы, независимые издатели, редакторы и журналисты — не политики, решившие посвятить свою жизнь исключительно борьбе за власть — она нам не нужна, она, в той степени, как мы ее понимаем, уже есть у нас, и отнять ее не сможет никакой политик;

— власть эту дают нам наши читатели, и мы служим им верой и правдой, строго в рамках существующего на сегодняшний день в стране законодательства, регулирующего нашу деятельность.

С сожалением мы вынуждены констатировать тот прискорбный факт, что Ваше, г-н Председатель, решение по обвинению наших газет в антигосударственной деятельности находится в одном ряду с теми властными актами последнего времени, которые прямо направлены на внеконституционные ограничения прав и свобод граждан Беларуси. В частности, конституционно гарантированного права на получение, хранение и распространение информации.

Ознакомившись с Вашим решением, мы окончательно убедились: нам не на что надеяться, у нас нет ни гарантов, ни защитников наших прав и свобод, мы живем и трудимся в правовом зазеркалье, где не правит Закон, а торжествует «целесообразность текущего момента». Мы — в тупике.

Но мы верим, что выйдем из этого порочного круга. Знаем, что скоро наступит тот час, когда пресса займет достойное место, будет служить обществу, а не тем, кто пытается узурпировать власть.

Нас рассудит История. Она все и всех расставит по своим местам.

**Иосиф СЕРЕДИЧ**, учредитель и главный редактор газеты «Народная воля»
**Павел ЖУК**, учредитель и и.о. главного редактора газеты НАВІНЫ
**Петр МАРЦЕВ**, главный редактор «Белорусской деловой газеты»
**Ирина ХАЛИП**, главный редактор газеты «Имя»
**Александр УЛИТЕНОК**, главный редактор газеты «Свободные новости»
**Николай МАРКЕВИЧ**, главный редактор газеты «Пагоня»
**Алексей КОРОЛЬ**, главный редактор газеты «Згода»

## ГОЛАС ВУЛІЦЫ

**1. Принимали ли вы либо ваши знакомые участие в прошедших выборах президента?**
**2. Лукашенко и оппозиция: для кого из них прошедшие выборы можно считать победой, а для кого поражением?**



**НАЙМАН,** предприниматель

— Нет, меня в Минске не было, но если бы и был — не пошел бы. Слишком все подвешено как-то... Организовано неважно.

— Для оппозиции выборы сыграли отрицательную роль. Нужно было население более широко информировать, а так мало кто знал. Для Лукашенко? Да ему эти выборы до одного места.



**Александр ЛЕНКИН,** режиссер-мультипликатор

— Я — нет, а вот знакомые голосовали. Правда, в то, что проголосовало 4 миллиона, я не верю.


— Эти выборы абсолютно ничего не значили. Ни для оппозиции, ни тем более для Лукашенко, которому давно на все нас...ть.



**РАИСА,** учитель

— К нам никто не пришел, но если бы пришли, мы бы приняли участие обязательно.

— Любой результат, если он есть, уже положительный. Даже если он отрицательный. А Лукашенко, по-моему, наплевать на все.



**ПАВЕЛ,** автослесарь

— Да, и все знакомые голосовали, у нас всех обошли.

— А мне все равно. От нового президента лучше не будет, поэтому меня Лукашенко удовлетворяет.

**ЛЮДМИЛА,** преподаватель военной академии (фотографироваться отказалась):

— Хоть я и занимаюсь воспитанием ребят в военной академии, я — истинная женщина, и от политики стараюсь держаться подальше.


— Оппозиция в свете этих выборов просто несолидно выглядит. А. Лукашенко — наш президент, а я воспитана патриотически и о президенте плохо никогда не говорю. ■

Задавал вопросы **Алексей ШИДЛОВСКИЙ**


## ПОНЕДЕЛЬНИК • 24 МАЯ




06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.15 Резонанс.
09.00 Новости.
09.10 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.25 Телебарометр. Прогноз погоды.
09.40 «Сегодня с вами...» Художественный руководитель Государственного ансамбля танца Республики Беларусь Валентин Дудкевич.
10.05 Здоровье. Тележурнал.
10.30 Детский экран. Мультфильм.
10.40 «Время и люди». Телеочерк о директоре Бобруйского комбината нетканых материалов Александре Катуренко.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.15 **«Ветер в спину»**. Телесериал.
12.05 Теленавигатор.
12.25 «Песня о зубре», «Кесарь-богатырь». Мультфильмы.
13.00 Новости.
13.15 К 55-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. **«Плач перепелки»**. Телесериал («Беларусьфильм»). 1-я серия.
14.35 «Глековы». Док. фильм.
15.00 Новости.
15.10 Сериал для детей. **«Боишься ли ты темноты?»** (Канада).
15.35 ТВ – школе. Изобразительное искусство. 4-й класс. Виды и жанры изобразительного искусства.
15.55 «Было, есть, будет...» Док. фильм («Белвидеоцентр»).
16.05 Ко Дню славянской письменности и культуры. «Да будет свет». Танковские чтения.
16.35 Автопарк.
16.45 Премьера песни.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 «А музыка звучит...» Песни на стихи А.Бадака.
17.45 «Слово к Вам, Георгий Кониский». Док. фильм.
18.05 **«Ветер в спину»**. Телесериал.
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: «Разговор в прямом эфире», «Что делать?», юмористическая рубрика «Понедельник с «Христофором».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 О.Янковский в худ. фильме **«Я, Франциск Скорина...»**.
23.40 Криминальная хроника.
23.45 Белорусский хит-парад.
23.50 Третий тайм.
00.20 Новости.
00.30 «Мечтой любви, мечтой прекрасной». Фильм-концерт.



13.30 Открытый чемпионат Франции по теннису.
14.00, 17.00 Новости.
14.15 Сериал **«Космическая полиция»**.
14.45 Мультсеанс. «Ну, погоди!».
14.55 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 **«Во имя любви»**. Сериал.
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Программа «Человек в маске».
18.45 Сериал **«Сегун»**.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Сериал **«Горец-IV»**.
21.40 Взгляд.
22.25 Однако.
22.40 Худ. фильм **«Минин и Пожарский»**.




16.00, 19.00, 23.40 Вести.
16.30 «Башня».
17.00 «Навстречу ТЭФИ!».
17.15 Гомеопатия и здоровье.
17.20 Худ. фильм **«Открытая книга»**.
18.30 Сериал **«Да, господин министр!»**.
19.40 Подробности.
19.50 Любовь с первого взгляда.
20.25 Худ. фильм **«Мой лучший друг – генерал Василий, сын Иосифа»**.
22.20 Акуна матата.
23.25 Дежурная часть.
00.10 Магазин на диване.
00.25 Прогноз погоды.




07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 **«Чародейки из предместья»**. Худ. фильм.
08.45 Книжный кладезь.
09.00 **«Медведь»**. Худ. фильм.
09.45 «Художник с Остоженки».
10.20 «Грустить не надо». Творческий вечер Ф.Чеханкова.
11.00 Станица Лондонская.
11.40 После новостей...
12.00 «Повести Белкина». Спектакль.
13.10 Э.Григ. «Норвежские танцы».
13.45 «Осенние портреты».
14.10 «Российский курьер».
14.50 «Тут шумят чужие города».
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Лукоморье».
15.30 «Встречи на Пикрис-горе».
